УДК 373.2
УДК 372.3/4+811.161.3

# НАЦЫЯНАЛЬНА-МОЎНАЯ АДУКАЦЫЯ ДЗЯЦЕЙ РАННЯГА І ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

# NATIONAL LANGUAGE EDUCATION OF CHILDREN OF EARLY AND PRESCHOOL AGE IN THE REPUBLIC OF BELARUS

***М. Э. Трухановіч / M. Trukhanovich***
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі*
*«Акадэмія паслядыпломнай адукацыі»*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

У артыкуле паказваецца месца нацыянальна-моўнай адукацыі ў структуры адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі Рэспублікі Беларусь. Раскрываюцца яе мэта, задачы і інструментальныя складнікі. Акрэсліваецца шэраг пытанняў, звязаных з ажыццяўленнем нацыянальна-моўнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі.

The article shows the place of national language education in the structure of the educational program of preschool education in the Republic of Belarus. Its purpose, objectives and instrumental components are revealed. A number of issues related to the implementation of national language education at the level of preschool education are outlined.

***Ключавыя словы:*** білінгвальная адукацыя; дашкольная адукацыя; нацыянальна-моўная адукацыя; адукацыйная праграма.

***Keywords:***bilingual education; preschool education; national language education; educational program.

У адпаведнасці з шэрагам нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь замацаваны статус беларускай і рускай дзяржаўных моў як асноўных моў навучання і выхавання. Дзяржава гарантуе грамадзянам права выбару мовы навучання і выхавання і стварае адпаведныя ўмовы для рэалізацыі гэтага права на розных узроўнях адукацыі, у тым ліку і дашкольнай.У інструктыўна-метадычных дакументах сістэмы дашкольнай адукацыі да навучальнага года падкрэсліваецца, што навучанне і выхаванне дзяцей дашкольнага ўзросту арганізуюцца ва ўмовах блізкароднаснага (беларуска-рускага) білінгвізму і накіраваны, у тым ліку, і на засваенне імі дзвюх дзяржаўных моў.

На думку вядомага расійскага лінгвіста сярэдзіны мінулага стагоддзя Л. У. Шчэрбы, можна толькі зайздросціць тым народам, якія з-за абставін асуджаныя на двухмоўе. Менавіта Беларусі пашчасціла знаходзіцца ў спецыфічных сацыялінгвістычных умовах, якія даюць магчымасць кожнаму дзіцяці вырасці сапраўднай білінгвальнай асобай, дзякуючы асаблівасцям ажыццяўлення моўнай адукацыі.

Паняцце моўная адукацыя значна шырэй паняцця «навучанне мове». Моўная адукацыя арыентавана не толькі на навучанне дзіцяці асноўным відам маўлення, але і на выхаванне каштоўнаснага стаўлення да роднай мовы ў працэсе пазнання нацыянальнай культуры сродкамі роднай мовы. Першапачатковая моўная адукацыя спрыяе фарміраванню асобы шляхам увядзення ў моўную культуру у працэсе яе засваення, прысваення і творчага пераўтварэння, з дапамогай якіх дзіця становіцца яе носьбітам і творцам.

Асаблівасць моўнай адукацыі на роднай мове ў Рэспубліцы Беларусь абумоўлена вышэй адзначаным дзяржаўным двухмоўем. Менавіта адной з задач вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі панапрамку маўленчага развіцця дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту з'яўляецца фарміраванне ўстойлівай цікавасці і станоўчых адносін да беларускай і рускай моў, жаданне авалодаць імі. Такім чынам, вынікам моўнай адукацыі, накіраванай на маўленчае і лінгвістычнае развіцце дзяцей дашкольнага ўзросту, павінна стаць білінгвальная асоба, якая валодае першапачатковымі здольнасцямі мець зносіны на дзвюх дзяржаўных мовах.Гэта значыць, што ў дачыненні да моўнай адукацыі на роднай мове на ўзроўні дашкольнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь варта весці гаворку аб паўнавартаснай білінгвальнай адукацыі.

Само паняцце «нацыянальна-моўная адукацыя» у розных сінанімічных спалучэннях можна сустрэць у шэрагу навуковых прац, якія ўздымаюць пытанні білінгвальнай адукацыі. Так, А. Я. Местнікава адзначае, што этнамоўная адукацыя з’яўляецца часткай этнакультурнай адукацыі, якая ўяўляе сістэму навучання і выхавання на нацыянальнай мове. Змест этнамоўнай адукацыі дазваляе развіваць і захоўваць моўную, этнічную і культурна-гістарычную цэласнасць асобы [3, с. 7]. С. А. Барагякаў і Р. С. Бозіеў таксама выкарыстоўваюць паняцце «этамоўная адукацыя» і адзначаюць неабходнасць распрацоўкі інтэгратыўна-развіваючых мадэляў этнамоўнай адукацыі як фактару гарманічнага развіцця этнакультурнай і нацыянальна-грамадзянскай ідэнтычнасці ў падрастаючых пакаленняў[1, с. 3-6]. А. Г. Дырхеева ўжывае паняцце «этналінгвістычная адукацыя» і выкарыстоўвае яго і ў дачыненні да навучання нацыянальнай мове, і ўвогуле, даажыццяўлення адукацыйнага працэсу на ей ў сітуацыі білінгвізму[2, с. 116-120].

Н. С. Старжынская трактуегэта паняцце ў сувязі з адносінамі да моўнай адукацыі на роднай мове. Даследчыца адзначае, што «па адносінах да моўнай адукацыі на роднай мове можна гаварыць аб паняцці нацыянальна-моўнай адукацыі, у працэсе якой дашкольнік уваходзіць у родную нацыянальную моўную культуру, у яе прастору…».Н. С. Старжынская разглядае працэс вывучэння роднай мовы як інструмент фарміравання нацыянальна-моўнай культуры, накіраваны на развіцце асобасна значных уяўленняў, разуменне сістэмы каштоўнасцей уласнай лінгвакультурнай агульнасці [4, с. 7].

Такім чынам, нацыянальна-моўную адукацыю неабходна разглядаць і як навучанне нацыянальнай мове і як арганізацыю адукацыйнага працэсу, які ажыццяўляецца на нацыянальнай мове адпаведна адукацыйнай праграме.

У прадстаўленых вызначэннях змест паняцця «нацыянальна-моўная адукацыя» цалкам адпавядае дзейнасці, накіраванай на стварэнне ўмоў для авалодання нацыянальнай мовай дзецьмі ранняга і дашкольнага ўзросту ў рамках мэтанакіраванага адукацыйнага працэсу. Мэтазгодна весці гаворку менавіта аб адукацыі, бо працэс засваення мовы ў выпадку нацыянальна-моўнай адукацыі спалучае ў сябе навучанне і выхаванне. З мэтай забеспячэння максімальна спрыяльных умоў для развіцця маўленчых навыкаў, далучэння выхаванцаў да беларускай нацыянальнай культуры, паспяховасці фарміравання двухмоўя ў адукацыйная праграме дашкольнай адукацыі ўлічваецца неабходнасць навучання і выхавання дзяцей на нацыянальнай мове.

Вывучэнне беларускай мовы выхаванцамі забяспечвае эфектыўнасць працы ў такіх,адзначаных у адукацыйным стандарце дашкольнай адукацыі, напрамках выхаваўчай работы, як:грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне; полікультурнае выхаванне.

Менавіта нацыянальная мова выступае эфектыўным сродкам выхавання, з дапамогай якога выхаванцы далучаюцца да багатай культурнай спадчыны беларускага народа. Авалоданне нацыянальнай мовай спрыяе нацыянальнай ідэнтыфікацыі, на аснове якой фарміруецца нацыянальная самасвядомасць і патрыятычныя пачуцці. Таму многія педагогі мінулага і сучаснасці вялікае значэнне надаюць мове нацыянальнай прыналежнасці дзіцяці і адзначаюць, што вучыць беларускай мове варта ад самага ранняга ўзросту (Е. А. Андрэева, Дз. М. Дубініна., Т. В. Паліева, В. М. Смаль, Н. С. Старжынская і інш.).

Для рэалізацыі нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту створана пэўнае навукова-метадычная забеспячэнне. Навукова-метадычнае забеспячэнне нацыянальна-моўнай адукацыі змяшчае вучэбна-праграмную дакументацыю, і ў першую чаргу,вучэбную праграму дашкольнай адукацыі.Напрамак «Маўленчае развіцце» вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі забяспечвае авалоданне нормамі і правіламі роднай мовы ў сітуацыі двухмоўя, развіцце камунікатыўных здольнасцей, элементарнае ўсведамленне моўнай рэчаіснасці, падрыхтоўку да навучання грамаце. Таксама вучэбная праграма дашкольнай адукацыі змяшчае ў нейкім сэнсе і інструментальны складнік, якім з’яўляеццапрыкладнае кола чытання твораў мастацкай літаратуры на беларускай мове для кожнай групы ранняга і дашкольнага ўзросту. Менавіта мастацкая літаратура з’яўляецца асноўным сродкам далучэння дзяцей да нацыянальнага моўнага багацця.Інструментальным складнікам таксама можна лічыць і рэкамендаваны музычны рэпертуар на беларускай мове для дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту, які спрыяе маўленчаму развіццю дзяцей, фарміраванню цікавасці да роднага слова ў працэсе вывучэння і выканання музычных песенных твора.

Навукова-метадычная забеспячэнне маўленчага і лінгвістычнага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту на нацыянальнай мове ўключае дапаможнікі, якія ўваходзяць у вучэбна-метадычны комплекс «Я мову родную люблю» і вучэбна-метадычны комплекс «Мае першыя ўрокі» (Н. С. Стражынская, Д. М. Дубініна).

Пералік вучэбных выданняў для выкарыстання ва ўстановах адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дашкольнай адукацыі, у якасці вучэбных дапаможнікаў для выхаванцаў груп з беларускай мовай навучання і выхавання, ўключае амаль такую ж колькасць падручнікаў  як і для груп з рускай мовай навучання і выхавання  і штогод папаўняецца і абнаўляецца.

Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу спрыяе ўключэнню дзвюх моў у разнастайныя віды дзіцячай дзейнасці, а таксама правядзенню спецыяльна арганізаваных форм адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці са зместам вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі.

Як вынік нацыянальна-моўнай адукацыі акрэслены пэўныя патрабаванні да ўзроўню авалодання нацыянальнай мовай у працэсе атрымання дашкольнай адукацыі. Яны прадстаўлены ў адукацыйным стандарце дашкольнай адукацыі па адукацыйнай галіне «Развіцце маўлення і культура маўленчых зносін» да кожнай узроставай групы.

Трэба адзначаць, што гэтыя патрабаванні дыферэнцаваныя ў залежнасці ад мовы навучання і выхавання ва ўстанове дашкольная адукацыі. У групах з беларускай мовай навучання і выхавання, патрабаванні да вынікаў  засваення  адукацыйнай галіны «Развіцце маўлення і культура маўленчых зносін» больш глыбокія і складаныя,бо ўлічваецца, што асноўнай мовай адукацыйнага працэсу і зносін выхаванцаў і выхавальніка ў гэтых групах з’яўляецца беларуская.

На падставе праведзенага аналізу можна зрабіць  выснову пра тое, што ў структуры адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі,дзякуючы намаганням і даследаванням беларускіх вучоных, і перш за ўсе Н. С. Старжынскай,нададзена вялікая  ўвага маўленчаму і лінгвістычнаму развіццю дзяцей, авалоданню імі  багаццямі нацыянальнай мовы,як асноўнаму элементу фарміравання асобы, цесна звязанаму з разумовым і маральным развіццем. Такім чынам, можна сцвярджаць што, нацыянальна-моўная адукацыя з'яўляецца вельмі важным,  прыярытэтным напрамкам развіцця, выхавання і навучаннядзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Боргояко, С. А, Языковое образование *и* национально-языковая политика России / *С.* А. Боргояков*,* Р. С. Бозиев // Педагогика. - 2018. - № 11. - С. 3-16.

2. Дырхеева, Г. А. Этнолингвистическое образование в Бурятии / Г. А. Дырхееева //  Вестник ЗабГУ – 2013. – № 06 (97). – С. 116-120.

3. Местникова, А. Е. Этнолингвистическое образование коренных народов: историко-правовые аспекты языковой политики российской федерации xx–xxi веков / А. Е. Местникова // Фундаментальные исследования. – 2015. – № 2-9. – С. 2028-2032.

4. Старжынская, Н. С. Сучасныя падыходы да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту / Н. С. Старжынская // Пралеска. – 2016. – № 10. – С. 3–8.